Ба 41505

ДЗЯРЖАЎНАЯ БІБЛІЯТЭКА БССР ІМЯ В. І. ЛЕНІНА

# МАКСІМ ТАНК

ДЗЯРЖАУНАЕ
ВУЧЭБНА-ПЕДАГАГІЧНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1954

...ЛЕНІНА

Ба 41505
53.61.12

ДЗЯРЖАУНАЯ БІБЛІЯТЭКА БССР ІМЯ В. І. ЛЕНІНА

*Пісьменнікі БССР*
Серыя памятак чытача

# МАКСІМ ТАНК

Бібліяграфічная памятка чытача

Бел. адд.
1984 г.
БССР
імені
Леніна
бібліятэка

МІНСК 1954

Серыя бібліяграфічных памятак «Пісьменнікі БССР» разлічана на шырокія колы чытачоў і на бібліятэкараў масавых бібліятэк. Памяткі ставяць сваёй мэтай дапамагчы бібліятэкарам у іх даведачна-бібліяграфічнай рабоце, звязанай з прапагандай твораў беларускіх пісьменнікаў.

Памятка, прысвечаная лаўрэату Сталінскай прэміі Максіму Танку, змяшчае тэкст пастановы Совета Міністраў СССР аб прысуджэнні яму Сталінскай прэміі (1948 г.), асноўныя даты жыцця і творчасці паэта, спіс найбольш новых выданняў яго твораў, спіс твораў паэта, выданых на рускай мове і кароткі спіс крытычных артыкулаў аб творчасці М. Танка. Асобна выдзелены творы Максіма Танка, напісаныя і выданыя для дзяцей.

Якое светлае, сябры,
На долю выпала нам шчасце!
Дажыць да казачнай пары,
Да комунізма шлях пра-
класці...»

*Максім Танк*

«Дзённік міру» [1])

«Я ведаю адно, што песня
мусіць быць
Крылатай, боездольнай і ня-
зломнай,
Каб на любы фронт працы,
барацьбы
Яе паслаць мог сакратар
райкома».

*Максім Танк* — «Райком» [2])

---

[1]) М. Танк. Выбраныя творы. Мінск, ДВБ, 1952, стар. 629.
[2]) » » » стар. 341.



# МАКСІМ ТАНК

## АБ ПРЫСУДЖЭННІ СТАЛІНСКІХ ПРЭМІЙ ЗА ВЫДАТНЫЯ РАБОТЫ Ў ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ І КІНЕМАТАГРАФІІ ЗА 1947 ГОД

*ПАСТАНОВА СОВЕТА МІНІСТРАЎ СССР*

Совет Міністраў Саюза ССР пастанавіў прысудзіць Сталінскія прэміі за выдатныя работы 1947 года ў галіне:

. . . . . . . . . . . . . .

**Б. Паэзіі**

. . . . . . . . . . . . . .

Прэміі другой ступені ў размеры 50 000 рублёў

2. **ТАНКУ МАКСІМУ** (Скурко Яўгенію Іванавічу) за зборнік вершаў «Каб ведалі».

Газ. «Праўда» за 2/IV-1948 г.

. . . . . . . . . . . . . .

## АСНОЎНЫЯ ДАТЫ ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ТАНКА

1912 17 верасня 1912 г. у вёсцы Пількаўшчына, Мядзельскай воласці, Віленскай губерні, у сям'і малазямельнага селяніна Івана Фёдаравіча Скурко нарадзіўся сын Яўгеній (Яўгеній Іванавіч Скурко — Максім Танк).

1914 З пачатку першай сусветнай вайны 1914—1918 гг. бацька пісьменніка быў мабілізаван у царскую армію.

1915 Калі наблізіўся фронт маці з сынам пакінула родную вёску і дабралася да Масквы.

«Фронт бліжэй падышоў да нашай вёскі. Матка ахінула ў таўстую хатнюю куртку, закінула на плечы торбу сухароў, чайнік і прылучылася да абозу бежанцаў... Масква. Матка перш служыла ў пана, пасля ў палкоўніка... Кастрычнік застаў на фабрыцы. Жылі далёка, дзесь на прадмесці ў падвале, займалі койку, разам былі яшчэ чатыры сям'і бежанцаў.» (Максім Танк[1].)

1920 Максім Танк паступіў у школу ў Маскве.

1922 Сям'я Скурко вяртаецца ў родную вёску, якая знаходзілася пад уладай белапалякаў. Будучы пісьменнік жыў у вялікай сям'і свайго дзеда, вучыўся ў школе, улетку пасвіў скаціну.

---

[1]) М. Танк. На этапах. Вільна, 1936, стар. 8—9.

Вучыцца давялося Максіму Танку ў польскай школе ў вёсцы Шкленікава, бо другой школы блізка Пількаўшчыны не было.

Паэт успамінаў аб гэтым часе наступнае: «Школа. Памятаю верш — «Ktо ty jesteś — polak mały», памятаю шырокую лінейку, пры дапамозе якой укладалі нам і нацыянальную свядомасць, і школьную мудрасць. Праўда, я лічыўся лепшым вучнем...» [1])

1925 Скончыўшы школу, Максім Танк паступіў у трэці клас Віленскай прыватнай рускай гімназіі.

1927 Віленская руская прыватная гімназія, у якой вучыўся Максім Танк, была зачынена польскай уладай. Шэсць месяцаў вучыўся ён у Радашковіцкай беларускай гімназіі, якая ўтрымлівалася на сродкі насельніцтва. Калі і яна была зачынена, паступіў у Віленскую беларускую гімназію. У 1927 г. у гімназіі ўступіў у комсамол. За актыўны ўдзел у вучнёўскай забастоўцы Максім Танк быў выключан з гімназіі.

1928 Максім Танк паступае на тэхнічна-меліярацыйныя курсы.

1930 З тэхнічна-меліярацыйных курсаў Максім Танк пераводзіцца ў Вілейскую рускую гімназію.

1931 Яшчэ ў Вілейскай гімназіі Максім Танк пачаў пісаць вершы. Разам з другімі комсамольцамі ён выдаваў падпольны юнацкі часопіс «Пралом», у якім быў змешчан першы верш паэта «Песня».

1932 Максім Танк скончыў гімназію. За ўдзел у падпольным комсамольскім друку ён быў арыштаваны. Тут, у астрозе «Лукішкі» (г. Вільна), 10 чэрвеня 1932 г. напісан самы ранні з твораў

---

[1]) М. Танк. На этапах. Вільна, 1936, стар. 9—10.

паэта, пазней сабраных аўтарам у кнігу «На этапах» (1936), верш «Вагон калыша».

Пасля сканчэння следства паэт быў вызвален пад залог.

У 1940 г. Максім Танк успамінаў у якіх умовах пачыналася яго творчая дзейнасць. Паэт пісаў: «Першыя творы, якія ўжо не паліў і якія ўцалелі, напісаў я ў 1932 годзе ў астрозе на Лукішках, куды трапіў за ўдзел у падпольнай прэсе. Цесныя і цёмныя былі нашы камеры. Выцягнеш рукі — дакранешся сырых сцен. Днём на іх убачыш напісаныя нечым вострым прозвішча, адседжаныя гады і вершы. Трывожаць гэтыя шрамы, не даюць заснуць і сам пачынаеш пісаць.

Часамі таварышы, адсядзеўшыя свой тэрмін, давыносілі гэтыя вершы на волю і тады яны даходзілі да вёскі. Чыталі іх там, папраўлялі, перапісвалі. Не было дзе друкаваць. Для творчасці, вырасшай за кратамі, не было месца на старонках існаваўшых часопісаў. Таму большая частка нашых твораў засталася ў памяці і ў рукапісах, калі не гублялася ў судовых актах. Зноў-жа тыя творы, якім удавалася пабачыць свет, калечыліся цэнзурай. Немагчыма было проста сказаць аб тым, што думаў. Трэба было гэта хаваць паміж радкоў. І таму ў іх чуецца шмат недасказанага.

Абставіны, у якіх пісаліся гэтыя вершы, не спрыялі літаратурнай працы. Гэта былі часы, калі дрот калючы перасякаў нашы дарогі, а тысячы лепшых сыноў народа мучыліся ў канцэнтрацыйных лагерах. Гэта былі часы, калі за кожным з нас хадзіў сышчык, а беларускія рэакцыянеры на кожнага, каго не ўдалося ўцягнуць у свой гразкі панадворак, пісалі даносы ў дэфензіву.

Гэта былі часы, калі росчыркам пяра азвярэлых паланізатараў, паноў Бацянскіх, было выкрэслена слова беларус і беларуская літаратура, а землі заходне - беларускія называліся «крэсамі». [1])

З 1932 да 1933 года працаваў у падполлі ў Заходняй Беларусі інструктарам комсамола.

1933 Максім Танк быў арыштаваны жандармерыяй каля мястэчка Глыбокае і асуджан Віленскім судом на 6 год зняволення. Але апеляцыйны суд прысудзіў яго да 2-х год умоўна і да пазбаўлення правоў на 8 год. Паэт быў вызвален з турмы і зноў працаваў на падпольнай комсамольскай рабоце.

1936 Максім Танк уступае ў члены Комуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Працуе ў падпольным комуністычным друку і легальным друку так званага «Народнага фронта».

Пры дапамозе Компартыі Заходняй Беларусі выдаецца першы зборнік вершаў паэта **«На этапах»** (Вільна, выданне Васіля Труцькі, 1936), у які ўвайшлі рэволюцыйныя вершы паэта 1932— 1936 гг.

Кніга была канфіскавана фашысцкай цэнзурай. Самога паэта асудзілі за кнігу на 6 месяцаў турэмнага заключэння.

Вось што пісаў аб гэтым пазней сам паэт:

«У 1936 годзе я сабраў свае вершы ў зборнік «На этапах». Выданы ў г. Вільні зборнік быў канфіскаваны. Толькі пару сот экземпляраў удалося схаваць і пусціць на вёску, дзе іх аж да прыходу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, з-пад палы, хаваючыся чыталі. Пасля і паэма

---

[1]) М. Танк. Выбраныя вершы. Мінск, ДВБ, 1940, стар. 5—6.

«Нарач» была абрэзана цэнзурай. Толькі два зборнікі — «Журавінавы цвет» і «Пад мачтай» — убачылі свет і то дзякуючы таму, што некаторыя радкі вершаў былі выкінуты або заменены».[1])

1937 Выдаецца другі зборнік вершаў Максіма Танка **«Журавінавы цвет»** (Вільна, выданне Ф. Стэцкевіча і Р. Шырмы). У зборнік увайшлі першыя паэмы Максіма Танка «Журавінавы цвет» і «Сказ пра Вяля».

Паэт заканчвае эпічную паэму аб паўстанні нарачанскіх рыбакоў у 1935 г. «Нарач». З вялікімі цэнзарскімі купюрамі паэма была надрукавана ў часопісе «Калоссе» і выдана кнігай «Нарач» (Вільна, 1937).

1938 Выдан зборнік вершаў паэта **«Пад мачтай»** (Вільна, 1938).

Максім Танк піша гістарычную паэму «Каліноўскі».

1939 З 17-га верасня 1939 года — дня вызвалення Заходняй Беларусі—у жыцці і творчасці Максіма Танка пачынаецца новы перыяд. У гэты дзень паэт піша сваё ўсхваляванае прывітанне байцам Совецкай Арміі, Совецкаму народу — «Здарова, таварышы!»

«Здарова таварышы! Доўга чакалі
Мы Вас і чакала ўся наша зямля.
Не раз мы выходзілі ў сінія далі,
Не раз угляdaліся ў сонечны шлях!

Пра вас нашы песні складаліся шчыра,
І колас засмяглы у полі звінеў,
І кожнай вясною, вітаючы вырай,
Лавілі усходняга ветру напеў.

[1]) М. Танк. Выбраныя вершы. Мінск, ДВБ, 1940, стар. 6.

Начамі паўзлі да калючага дроту,
Якім нас хацелі навек раздзяліць,
Мы рвалі яго, звалі Вас на падмогу,—
І вы, дарагія, пачулі, прыйшлі».[1])

Паэт удзельнічае ў падрыхтоўцы народнага сходу, працуе літаратурным работнікам у Вілейскай абласной газеце.

1940—41 Максім Танк жыве ў Беластоку і займаецца творчай літаратурнай працай. У 1940 г. выходзіць першая кніга паэта ў Совецкім Саюзе «Выбраныя вершы». У кнігу ўвайшлі вершы 1935—1939 гг. і прадмова аўтара, напісаная 20 студзеня 1940 года.

1941 У першыя дні вайны Максім Танк уступае ў рады Совецкай Арміі. Працуе ў франтавой газеце «За Совецкую Беларусь».

1 94 ЦК КП(б)Б адклікае Максіма Танка з арміі для работы ў партызанскім друку. Паэт працуе сакратаром рэдакцыі агітплаката «Раздавім фашысцкую гадзіну» (1942 — 1945).

1943 За заслугі перад Радзімай у час Вялікай Айчыннай вайны Яўгеній Іванавіч Скурко (Максім Танк) 16 верасня 1943 года ўзнагароджан ордэнам Чырвонага сцяга. [2])

У лістападзе 1943 г. Максім Танк прынят у члены ВКП(б).

Выдаецца напісаная ў гэтым годзе паэма М. Танка аб партызанскай барацьбе беларускага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны ў былой Заходняй Веларусі — **«Янук Сяліба»** (Выд-ва ЦК КП(б)Б «Совецкая Беларусь», 1943).

---

[1]) М. Танк. Выбраныя творы. Мінск, ДВБ, 1952, стар. 95.
[2]) Гл газ. «Совецкая Беларусь» № 90 за 18/IX-1943 г.

1944 Паэма «Янук Сяліба» (М., ОГИЗ, 1944) выдана на рускай мове.

1945 Максім Танк узнагароджан медалямі «За оборону Москвы» і «Партизану Отечественной войны» 1-й ступені.

Паэт жыве ў Мінску і працуе ў рэдакцыі гумарыстычнага часопіса «Вожык» (1945 — 1948).

У гэтым годзе выданы 2 кнігі вершаў Максіма Танка: «**Вастрыце зброю**» (Мінск, ДВБ, 1945), у якую ўвайшлі вершы і паэмы, напісаныя ў час Вялікай Айчыннай вайны, і кніга выбраных твораў пісьменніка 1935 — 1944 гг. «Праз вогненны небасхіл» (Мінск, ДВБ, 1945).

1946 Максім Танк узнагароджан медалямі «За доблестный труд». У гэтым годзе піша ён паэму аб старадаўнім народным беларускім мастаку «Люцыян Таполя». Выдана вершаваная казка М. Танка для дзяцей «Галінка і верабей» (Мінск, Саюздрук, 1946).

1947 9 лютага 1947 г. Яўгеній Іванавіч Скурко (Максім Танк) выбран у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР.[1])

Выданы кнігі М. Танка «**Вершы**» (Мінск, ДВБ, 1947), «**Выбраныя вершы**» (Мінск, ДВБ, 1947), «**Казка пра мядзведзя**» (Мінск, ДВБ, 1947) і перавыдана паэма «**Нарач**» (Мінск, ДВБ, 1947).

1948 Максім Танк удастоен Сталінскай прэміі другой ступені за кнігу вершаў «Каб ведалі».[2]) З 1948 г. паэт працуе галоўным рэдактарам літаратурнага часопіса «Полымя».

Выданы кнігі М. Танка «**Каб ведалі**» (Мінск, ДВБ, 1948), «**Казкі лірніка**» (Мінск, ДВБ, 1948),

---

[1]) Гл. газ. «Звязда» № 33 за 13/II-1947 г.

[2]) Гл. газ. «Правда» за 2/IV-1948 г.

**«Вершы»** (Мінск, ДВБ, «Школьная б-ка», 1948). У перакладзе на рускую мову вышлі **«Избранные стихотворения»** (Л., «Советский писатель», 1948) і **«Стихотворения»** (М., изд-во «Правда», Б-ка «Огонек» № 17, 1948).

1949 Да 30-годдзя Беларускай ССР (1 студзеня 1949 г.) Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 30 снежня 1948 г. Яўгеній Іванавіч Скурко (Максім Танк) узнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага сцяга.[1]) 20—25 красавіка Максім Танк удзельнічае ў рабоце першага сусветнага Кангрэса прыхільнікаў міру (Прага). Свае ўражанні аб кангрэсу паэт выказаў у паэме «Дзённік міру», закончанай 14/VIII-1949 г.

Выходзіць кніга вершаў Максіма Танка для дзяцей **«Урачыстае абяцанне»**. (Мінск, ДВБ, 1949).

У перакладзе на рускую мову выданы кнігі **«Чтобы ведали»** (Минск, ГИЗ БССР, 1949) і **«Избранное»** (М., гослитиздат, 1949).

1950 Максім Танк удзельнічае ў рабоце месячніка совецка-польскай дружбы ў Варшаве.

1951 25 лютага Яўгеній Іванавіч Скурко (Максім Танк) выбран дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР.[2])

Максім Танк удзельнічае ў рабоце месячніка совецка-венгерскай дружбы.

Выдаюцца новыя кнігі вершаў паэта: **«На камні, жалезе і золаце»** (Мінск, ДВБ, 1951) у арыгінале і ў перакладзе на рускую мову; **«Сярод лясоў наднёманскіх»** (Мінск, ДВБ, 1951). **«Избранные стихотворения»** (М.-Л., Детгиз, 1951).

---

[1]) Гл. газ. «Звязда» № 6 за 7/I-1949 г.
[2]) Гл. газ. «Звязда» № 44 за 28/II-1951 г.

1952 Выдана кніга Максіма Танка «Выбраныя творы» (Мінск, ДВБ, 1952).

1953 У перакладзе на рускую мову выданы выбраныя творы Максіма Танка **«Стихи, сказки, поэмы»** (М., Гослитиздат, 1953) і кніжка для дзяцей малодшага ўзросту **«Веточка и воробей»** (Минск, ГИЗ БССР, 1953).

Новыя вершы, напісаныя Максімам Танкам у 1953 годзе, апублікаваны ў часопісе «Полымя» №№ 1, 2, 6, і 10 за 1953 г.

1954 На Мінскай VIII абласной партыйнай канфэрэнцыі Максім Танк выбран у састаў абкома КП Беларусі і дэлегатам на XXI з'езд КПБ.[1]) 10—13 лютага 1954 г. удзельнічаў у рабоце XXI з'езда КП Беларусі.

Новыя вершы М. Танка надрукаваны ў часопісе «Полымя» №№ 1, 2, 7 за 1954 г.

---

[1]) Гл. газ. «Мінская праўда» № 26 за 5/II-1954 г.

## КНІГІ МАКСІМА ТАНКА

1. **Каб ведалі.** Вершы. Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1948, 180 стар., 4 000 экз., 7 руб.

У зборніку змешчаны вершы 1945 — 1948 гг. Кніга ўдастоена Сталінскай прэміі 2-ступені.

2. **На камні, жалезе і золаце.** Вершы. Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1951, 270 стар., 10 000 экз., 7 руб. 50 кап.

У кнігу ўвайшлі вершы 1948 — 1951 гг. і паэма «Дзённік міру».

3. **Вастрыце зброю.** Вершы. Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1945, 131 стар., 8 000 экз., 15 руб.

Кніга вершаў, напісаных аўтарам у дні Вялікай Айчыннай вайны (1941 — 1945) і паэма «Янук Сяліба» (1943).

4. **Праз вогненны небасхіл.** Вершы. Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1945, 224 стар., 8 000 экз., 16 руб.

У зборнік ўвайшлі выбраныя вершы з ранніх кніг Максіма Танка «На этапах» (1936), «Журавінавы цвет» (1937) і «Пад мачтай» (1938), выданых яшчэ ў Заходняй Беларусі і вершы, напісаныя паэтам пасля ўз'еднання беларускага народа ў адзінай соцыялістычнай дзяржаве.

Вершы 1939 — 1944 гг. змешчаны асобным раздзелам «Праз вогненны небасхіл».

5. **Выбраныя творы**. Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1952, 366 стар., 10 000 экз., 12 руб. 40 кап.

Зборнік выбраных вершаў і паэм Максіма Танка, які адлюстроўвае ўвесь творчы шлях паэта.

Кнігу складаюць тры раздзелы: «Вершы», «Казкі», і «Паэмы».

У першым раздзеле змешчаны ўсе вершы (1931—1951 гг.) у храналагічным парадку іх напісання.

Раздзел «Казкі» складаюць наступныя вершаваныя казкі, напісаныя аўтарам у розны час: «Мухамор» (1937), «Дзед і шчупак» (1937), «Казка пра мядзведзя» (1937), «Казка пра музыку» (1938), «Галінка і верабей» (1945), «Іван-ды-Мар'я» (1945), «Журавель і чапля» (1945), «Жук і слімак» (1950), «Сярод лясоў наднёманскіх» (1950) і «Дуб» (1951).

У канцы змешчаны паэмы: «Нарач» (1937), «Журавінавы цвет» (1937), «Сказ пра Вяля» (1937), «Каліноўскі» (1938), «Янук Сяліба» (1943), «Люцыян Таполя» (1946) і «Дзённік міру» (1949).

6. **Выбраныя вершы.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1947, 280 стар. (Выбраныя творы беларускай савецкай літаратуры 1917 — 1947), 8 000 экз., 9 руб.

Вершы, казкі і паэмы Максіма Танка, напісаныя ў 1934 — 1946 гг. змешчаны ў храналагічным парадку напісання.

Уступны артыкул да зборніка аб жыцці і літаратурнай творчасці паэта напісан А. Кучарам.

7. **Нарач**. Паэма. Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1947, 112 стар., 8 000 экз., 5 руб.

У кнізе змешчана прадмова аўтара аб гісторыі стварэння паэмы, напісаная Максімам Танкам 1 снежня 1945 г.

## КНІГІ МАКСІМА ТАНКА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ.

1. **Сярод лясоў наднёманскіх.** Малюнкі **М. Манасзона.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1951, 15 стар. з ілюстр., 30 000 экз., 1 руб. 50 кап.

У кніжцы з малюнкамі ў два колеры для малых дзяцей змешчаны вершы «Жалейка» і «Ірынка» і казкі: «Жук і слімак», «Сярод лясоў наднёманскіх», «Дуб».

2. **Урачыстае абяцанне.** (Вершы) Мінск, Дзярж. выд-ва

БССР, рэд. дзіцячай літ-ры, 1949., 72 стар. з ілюстр. 8 000 экз., 2 руб. 50 кап.

У кнізе змешчаны вершы, прысвечаныя Радзіме, партыі, героям Айчыннай вайны, піонерам і комсамольцам. У канцы змешчаны казкі: «Дзед і шчупак» і «Іван-ды-Мар'я».

3. **Казкі лірніка.** Малюнкі мастакоў **С. Раманава, Л. Замаха і В. Ціхановіча.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, рэд. дзіцяч. літ-ры, 1948, 47 стар. з ілюстр., 8 000 экз., 4 руб. 50 кап.

У кнізе з каляровымі малюнкамі змешчаны казкі: «Лірнік», «Казка пра музыку», «Мухамор», «Казка пра мядзведзя», «Галінка і верабей».

4. **Вершы.** Малюнкі **С. Раманава.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, рэд. дзіцяч. літ-ры, 1948, 284 стар., (Школьная б-ка), 12 000 экз., 6 руб.

У зборніку змешчаны выбраныя вершы, казкі і ўрыўкі з паэм Максіма Танка 1936 — 1946 гг. Прадмову аб жыцці і літаратурнай дзейнасці паэта напісала **З. Жыгалка.**

5. **Казка пра мядзведзя.** Малюнкі **В. Ціхановіча.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, рэд. дзіцяч. літ-ры, 1947, 24 стар. з ілюстр., 10 000 экз., 2 руб.

У кніжцы з каляровымі малюнкамі змешчаны казкі: «Казка пра мядзведзя», «Мухамор» і «Галінка і верабей».

6. **Вершы.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, рэд. дзіцяч. літ-ры, 1947, 125 стар., 8 000 экз., 3 руб.

Выбраныя вершы, казкі і ўрыўкі з паэм Максіма Танка 1936 — 1944 гг. напісання.

7. **Галінка і верабей.** Мінск, Саюздрук, 1946, 8 стар. з ілюстр., 50 кап.

ЛЕНІНА

## ТВОРЫ МАКСІМА ТАНКА Ў ПЕРАКЛАДЗЕ НА РУСКУЮ МОВУ

1. **Чтоб ведали.** Стихи. Минск, Гос. изд-во БССР, 1949, 191 стр., 4 000 экз., 5 руб. 50 коп.

2. **На камне, железе и золоте.** Стихи. Минск, Гос. изд-во БССР, 1951, 183 стр., 4 000 экз., 7 руб. 15 коп.

3. **Стихи, сказки, поэмы.** Авторизованный перевод с белорусского. М., худож. лит-ра, 1953, 407 стр., 25 000 экз., 9 руб. 46 коп.

4. **Избранные стихотворения.** Перев. с белорусского. Гравюры Ф. Константинова. М.-Л., Детгиз, 1951, 178 стр., с иллюстр., (Школьная б-ка), 25 000 экз., 2 руб. 10 коп.

5. **Избранное.** Авторизованный перевод с белорусского. М., Гослитиздат, 1949, 360 стр., 10 000 экз., 8 руб. 50 коп.

6. **Избранные стихи.** Перевод с белорусского. М., «Советский писатель», 1948, 296 стр., 11 руб.

7. **Стихотворения.** Перевод с белорусского **Анатолия Кудрейко**. М., «Правда» 1948, 40 стр., (Б-ка «Огонек» № 17), 150 000 экз., 60 коп.

8. **Янук Сялиба.** Поэма. Перевод с белорусского **П. Семынина**. М., худож. лит-ра, 1944, 77 стр., 3 руб.

9. **Веточка и воробей.** Перевод с белорусского **В. Потаповой**. Рисунки **В. Лашкевича.** Минск, ред. детск. лит-ры ГИЗ БССР, 1953, 10 стр., 50 000 экз., 1 руб. 15 коп.

10. **Ехал сказочник Гай.** Сборник стихов. М., Детгиз, 1954, 110.000 экз.

## КРЫТЫЧНЫЯ АРТЫКУЛЫ АБ ТВОРЧАСЦІ М. ТАНКА

1. **Агняцвет Э.** Барацьбіт за мір. Газ. «Літаратура і мастацтва», 10/II-1951 г.

2. **Барсток М.** Сборник стихов Максима Танка («На камне, железе и золоте»). Газ. «Известия», 7/II-1952 г.

3. **Зомерфельд Е. і Дубовік П.** Творы Максіма Танка для дзяцей. «Настаўніцкая газета», 30/III-1950 г.

4. **Клімковіч М.** З песняй барацьбы. Часопіс «Беларусь», 1948, № 5, стар. 12 — 15.

5. **Кулешов А.** Кандидат белорусского народа. Газ. «Известия», 6/II-1947 г.

6. **Кулешов А.** Опережая время. (О кн. М. Танка «Чтоб ведали») «Литературная газета», 3/IV-1948 г.

7. **Кучар А.** Максім Танк. У кн. **А. Кучар** «Літаратурна-крытычныя артыкулы». Мінск, ДВБ, 1953, стар. 495 — 559.

8. **Лынькоў М.** Яго натхняючая песня. Газ. «Звязда», 6/I-1948 г.

9. **Мозольков Е.** Поэзия борьбы. В кн. «Советская литература на подъеме». Сб. статей. М., «Сов. писатель», 1948, стр. 212 — 218.

10. **Панчанка П.** Лаўрэат Сталінскай прэміі Максім Танк. Газ. «Звязда», 4/IV-1948 г.

11. **Шчарбатаў Г.** Творчы год паэта. (Вершы М. Танка, напісаныя ў 1952 годзе). Газ. «Літаратура і мастацтва», 21/II-1953 г.

## ЗМЕСТ

Пастанова Совета Міністраў СССР ад 2/IV 1948 г. «Аб прысуджэнні Сталінскай прэміі за выдатныя работы ў галіне літаратуры і кінематаграфіі за 1947 г.» (Вытрымка) . . . . . 5
Асноўныя даты жыцця і творчасці Максіма Танка . . . . . 7
Кнігі Максіма Танка . . . . . 16
Кнігі Максіма Танка для дзяцей . . . . . 17
Творы Максіма Танка ў перакладзе на рускую мову . . . . . 19
Крытычныя артыкулы аб творчасці М. Танка . . . . . —

1964
Бел.
1994 г.

Склала *Н. Ватацы*
Рэдактар *Р. Казуной*
Тэхрэдактар *П. Сцержанаў*
Карэктар *Я. Плесанава*

Падпісана ў набор 18/VIII-1954 г. Падпісана да друку 25/IX-1954 г. АТ 04181. Тыраж 2 000 экз. Папера $70 \times 108^1/_{32}$. Аўт. арк. 0,54. Вуч.-выд. арк. 0,56. Пап. арк. 0,312. Друк. арк. 0,856. Цана 25 кап.
Зак. 583.

Друкарня імя Сталіна, Мінск, праспект імя Сталіна, 105.

Цана 25 кап.

B0000002589472